песні і танца «Над сінім Нёманам» (Гродзенскі р-н), аматарскіх тэатр. калектываў «Лідскія тэатральныя сустрэчы» (г. Ліда), дзіцячай эстр. творчасці «Масты надзей» (г. Масты), рэсп. конкурс маладых эстр. выканаўцаў «БелАЗаўскі акорд» (г. Жодзіна), фестываль нац. культур (г. Гродна) і інш. *А.М.Халікаў.*

**ВЕРЦЯЛІШКІ**, вёска ў Гродзенскім р-не. За 12 км на У ад Гродна, 8 км ад чыг. ст. Аульс на лініі Гродна—Масты, на аўтамагістралі Гродна—Вільнюс (Літва). Цэнтр Верцялішскага с/с. 1167 гаспадарак, 3258 ж. (2011).

Вядомы ў ВКЛ з 14 ст. як фамільны маёнтак гродзенскага кашталяна кн. Давыда Гарадзенскага. З 1559 каралеўскае ўладанне, сяло двара В. Гродзенскай эканоміі Трокскага ваяв. ВКЛ. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у Рас. імперыі, з 1802 у Гродзенскай губ. У 1848 — 58 двароў. З 1861 дзейнічала аднакласнае прыходскае вучылішча (у 1889/90 навуч. годзе навучаліся 74 хлопчыкі і 6 дзяўчынак). У 1885 сяло, цэнтр воласці Гродзенскага павета, 513 ж.; валасное праўленне, царк. прыход, вінакурня. У 1904 — 691 ж., у маёнтку 70 ж. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Гродзенскага павета Беластоцкага ваяв.; у сяле 515 ж., у фальварку 78 ж. З 1939 у БССР, з 12.10.1940 цэнтр сельсавета Гродзенскага р-на Беластоцкай вобл. У Вял. Айч. вайну з канца чэрв. 1941 да сярэдзіны ліп. 1944 акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. З 20.9.1944 у Гродзенскай вобл. 13.10.1967 вёска аб'яднана з нас. пунктам Торфазавод. У 1996 — 1042 гаспадаркі, 3108 ж.

Сучасныя В. — адзін з буйных добраўпарадкаваных агр.-прам. населеных пунктаў краіны. Забудоўваўся па генпланах 1967 (карэкціроўка 1980), 1988. Усе грамадскія і жылыя будынкі выкананы па эксперымент. і палепшаных тыпавых праектах. Архіт.-планіровачную структуру вызначаюць вуліцы Маладзёжная і Юбілейная, якія з прылеглымі да іх вуліцамі ўтвараюць некалькі невял. кварталаў. На цэнтр. пл. знаходзяцца 2-павярховы адм. будынак, Дом культуры, 3-блочны гандлёвы цэнтр з магазінамі, рэстаранам, Домам быту, гасцініцай. Завяршае ансамбль эксперымент. 4-павярховы 1-секцыйны дом. Да пл. прымыкае парк. Прам. зона развіваецца ў паўн.-зах. напрамку. Пры добраўпарадкаванні шырока выкарыстаны малыя архіт. формы, веранды, тэрасы, групы дэкар. дрэў, адкрытыя лужкі, алеі ніцых вербаў, газоны, кветнікі і інш.

У 2011 сярэдняя школа, інфармацыйны цэнтр, ДзЮСШ, школа мастацтваў, дашкольны Цэнтр развіцця дзіцяці, Цэнтр культуры і вольнага часу, амбулаторыя, аптэка, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і «Беларусбанка», сталовая, 5 магазінаў. Мемар. комплекс на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік Герою Сац. Працы і Герою Беларусі А.І.Дубко. Помнік архітэктуры — царква Аляксандра Неўскага (1854).

**ВЕРШ** (лац. versus), невялікі па аб'ёме і завершаны па сэнсе і форме твор, напісаны *вершаванай мовай.* Самым элементарным па кампазіцыйнай будове відам В. з'яўляецца дыстых (2-радкоўе). Змест В. часцей за ўсё абумоўлены лірычным перажываннем, у якім знаходзяць адлюстраванне драм., трагічныя, камічныя з'явы і падзеі, стаўленне да іх аўтара. В. ствараецца з дапамогай рытмічнай і гукавой арганізацыі, архітэктонікі, паэт. сінтаксісу і інш. У бел. л-ры В. з'явіўся ў 16 ст. і звязваецца з імем Ф.Скарыны, які ў прадмовах да сваіх кніг змясціў некалькі рыфмаваных радкоў. У залежнасці ад зместу і псіхал. тону В. падзяляюцца на жанры — гімн, ода, элегія, эпітафія і інш., віды: па колькасці радкоў — аднарадковік, двухрадковік, трохрадковік, чатырохрадковік і інш., па характары рыфм і рыфмоўкі — манарым, двурым, *бурымэ* і інш. Існуюць таксама цвёрдыя вершаваныя формы: *актавы*, *канцоны*, *рандо*, *санеты*, *танка*, *трыялеты*, *хоку* і інш. *І.М.Гоўзіч.*

**ВЕРШ У ПРО́ЗЕ**, лірычны твор у празаічнай форме. Валодае такімі прыкметамі лірычнага верша, як невял. аб'ём, павышаная эмацыянальнасць, звычайна бессюжэтная кампазіцыя (рудыментарны сюжэт), агульная ўстаноўка на перадачу суб'ектыўнага ўражання або перажывання, але не такімі сродкамі, як метр, рытм, рыфма. В. у п. адрозніваюць менавіта па метрычнай прыкмеце ад форм, прамежкавых паміж паэзіяй і прозай, — рытмічнай прозы і *верлібра*. Упершыню тэрмін «В. у п.» ўвёў Ш.Бадлер, у рус. л-ры вядомымі аўтарамі такіх вершаў сталі І.Тургенеў, І.Аненскі. Доўгі час у бел. літ.-знаўстве да В. у п. адносілі «Думкі ў дарозе» Я.Коласа, «Васількі», «Раны» Ядвігіна Ш., «Стогны душы», «Максімава зязюля» М.Гарэцкага, «Плач пралесак», «Пяюць начлежнікі», «Прытуліся ка мне» З.Бядулі. *І.М.Гоўзіч.*

**ВЕРШАВА́НАЯ МО́ВА**, асаблівы тып эмацыянальна афарбаванай, згушчанай мовы, у якой гранічна адчуваецца кожны кампанент, а найб. значныя гукі і сугуччы, словы, паўзы, вобразы не толькі акцэнтуюцца, але і ставяцца ў цэнтр увагі. Інтанацыйна, а на пісьме і графічна падзелена на супастаўляльныя паралельныя рады (вершаваныя радкі) у супрацьлегласць мове прозы. Характарызуецца сіметрыяй і перыядычнасцю члянення сінтаксічных адрэзкаў, арганізаванай рытмамелодыкай. Адсюль наяўнасць рыфмаў, строф, устаноўка на муз. гучанне. Вылучаюцца *белы верш*, *вольны верш*, *свабодны верш*, *дольнік*. В.м. пішуцца і некаторыя творы павучальнага ці рэкламнага характару, разлічаныя на хутчэйшае запамінанне, т.зв. *мнеманічныя вершы.*

**ВЕРШАВА́НЫ РЫТМ**, гл. ў арт. *Рытм.*

**ВЕРШАЗНА́ЎСТВА**, раздзел *паэтыкі*, які вывучае будову *верша*, уласцівасці *вершаванай мовы* і прынцыпы яе аналізу. В. ў большасці выпадкаў зводзіцца да вывучэння вершаванай фонікі, рытмікі і строфікі, астатнімі пытаннямі займаецца тэорыя л-ры. У эпохі антычнасці і сярэдневякоўя В. з'яўлялася апісальнай дысцыплінай і мела прыкладны і нарматыўны характар. Заснавальнікамі бел. В. з'яўляюцца Л.Зізаній («Граматыка славянская», 1596), які падаў кароткі курс тэорыі антычнага вер-